Источник: **«Звязда» - 2012-05-31**

## Медыяпрастора: "Беларуская думка"




**У майскім нумары часопіса "Беларуская думка" чытач знойдзе шмат цікавых і актуальных матэрыялаў. Журналісты выдання запрасілі да абмеркавання адной з найбольш значных падзей месяца — Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь — вядомых палітыкаў, дзяржаўных дзеячаў, навукоўцаў, прадстаўнікоў грамадскасці.**

Аб развіцці айчыннага турбізнэсу распавядае міністр спорту і турызму А. Качан, а пра змены, якія павінны адбыцца ў бліжэйшы час у сферы ЖКГ, — міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі А. Шарэц.

Змястоўным атрымаўся і палітычны блок матэрыялаў. Так, акадэмік Я. Бабосаў аналізуе інтэграцыйныя працэсы Адзінай эканамічнай прасторы (Беларусь, Расія, Казахстан) і разглядае перспектывы стварэння Еўразійскага саюза. Вядомы расійскі палітолаг А. Фурсаў разважае аб выніках нядаўніх прэзідэнцкіх выбараў у Расіі, дэтальна аналізуе палітычную сітуацыю, якая склалася ў гэтай краіне ў перадвыбарны перыяд, прыводзіць прыклады спробаў уплыву замежных палітыкаў і ўнутранай апазіцыі на працэс волявыяўлення расіян. Шэраг палітычных узрушэнняў апошняга часу, найбольш гучнымі з якіх аказаліся "арабская вясна" на Блізкім Усходзе, спробы дэстабілізацыі сітуацыі ў Беларусі і нядаўнія пратэстныя акцыі ў Расіі, даследуе ў артыкуле "Рэвалюцыйная хваля: урокі і высновы" галоўны рэдактар "Беларускай думкі" В.Гігін.

Чытачы даведаюцца пра няпросты жыццёвы шлях ураджэнца Маладзечаншчыны генерал-маёра І.Рухле — у артыкуле журналіста С. Галоўкі "Генерал, які мог стаць маршалам".

Доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук А. Каваленя артыкул "Засталася спадчына — людзьмі звацца" прысвяціў 130-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы.

**Сяргей ЖОЛУД.**